Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА

ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 40 (477) 11 КАСТРЫЧНІКА 2000 г.

Ахвярам Хірасімы, Нагасакі і Чарнобыля



24 верасня ў Менску на плошчы Незалежнасці ля касцёла св. Сымона і Алены адкрылі помнік ахвярам Хірасімы, Нагасакі і Чарнобыля. Усе работы па адліўцы, дастаўцы і ўстаноўцы помніка аплочаны грамадзянамі Японіі і Беларусі, якія пацярпелі ад ядзерных катастроф.

На здымку: ксёндз-магістр касцёла св. Сымона і Алены Уладзіслаў Завальнюк (зправа) на адкрыцці помніка.

Фота Віктара Талочкі, БелТА.

Якой быць Беларусі ў XXI стагоддзі?

25 верасня ў Менску адбылася Міжнародная канферэнцыя "Беларусь: мадэлі будучыні".

На канферэнцыі, у якой бралі ўдзел вядомыя беларускія палітыкі, прадстаўнікі ўраду краіны. айчынныя ды замежныя дыпламаты, а таксама палітолагі, эканамісты ды прадпрымальнікі, абмяркоўвалася канцэпцыя "Статэгія для Беларусі", што была падрыхтаваная групай экспертаў – прадстаўнікоў палітычных партыяў ды незалежных даследчых цэнтраў.

Усе прысутныя, у тым ліку і журналісты, атрымалі тэкст канцэпцыі, апублікаваны ў трох мовах: беларускай, рускай ды англійскай. Варта заўважыць, што беларускі варыянт быў падрыхтаваны сябрамі ТБМ. Ягоную вартасць адзначылі ў сваіх выступах як старшыня канферэнцыі Мечыслаў Грыб, гэтак і кіраўнік місіі АБСЕ ў Менску Ганс Георг Вік.

У спрэчках сярод іншых выступіў і старшыня Таварыства Алег Трусаў, які прапанаваў дадаць да тэксту канцэпцыі тры новыя раздзелы: Беларусь і беларуская нацыянальная ідэя; Беларусь і ейныя суседзі: Беларусь -- шматканфесійная краіна.

Першы раздзел павінен улучаць наступныя тэзісы:

1. Падрыхтоўка айчыннай палітычнай эліты. Стварэнне Беларускага нацыянальнага ўніверсітэту і ягоных філіялаў у старажытных беларускіх гарадах. Распрацоўка доўгатэрміновай дзяржаўнай праграмы навучання беларускіх студэнтаў у лепшых універсітэтах Еўропы і ЗША.

2. Беларуская мова – адзіная дзяржаўная мова краіны. Увесь працэс навучання (ад дзіцячага садка да ВНУ), а таксама паўсюдна справаводства мусяць весціся па-беларуску. Разам з тым увесці абавязковае вывучэнне ўва ўсіх школах і ВНУ краіны англійскай мовы, а таксама (з выбару навучэнцаў) адной з заходнееўрапейскіх і адной з славянскіх моваў.

3. Стварэнне нацыянальных навуковых школ: першачаргова -- гістарычнай, сацыялагічнай, філасофскай і эканамічнай.

4. Праграма доўгатэрміновай падрыхтоўкі айчынных дыпламатаў, вайскоўцаў ды паліцыянтаў.

Другі раздзел мусіць вызначыць кірункі беларускай палітыкі ў дачыненні да ўсіх непасрэдных суседзяў, а не толькі беларуска-расейскія стасункі.

Трэці раздзел мецьме такія пастулаты як:

1. Роўнасць усіх канфесіяў перад законам.

2. Вяртанне ўсіх адабраных бальшавікамі храмаў і іншай сакральнай маёмасці.

3. Стварэнне доўгатэрміновай праграмы аднаўлення разбураных за савецкім часам культавых будынкаў.

4. Добраўпарадкаванне могілкаў усіх канфесіяў дзяржаўным коштам.

5. Выдаткаванне дзяржаўных крэдытаў на ільготных умовах для стварэння дзіцячых нядзельных духоўных школак, а таксама сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў.

Наш кар-т.

Кастусю Тарасаву -- 60

Знакамітаму беларускаму пісьменніку гістарычнага жанру Кастусю Тарасаву споўнілася 60 гадоў.

Сакратарыят ТБМ, рэдакцыя газеты "Наша слова" шчыра віншуюць спадара Кастуся з узростам мудрых і зычаць плёну ў адкрыцці ўсё новых старонак нашай багацейшай і невядомай гісторыі.

Дарагія сябры "Нашага слова"!

Сёння мы паведамляем вам вынікі падпісной кампаніі на чацвёрты квартал 2000 года. У гэтым квартале падпіска, хоць і не значна, але выросла. Газета ідзе ў абсалютную большасць раёнаў Беларусі. Разам з тым мы маем, як сцвярджае Старшыня ТБМ, 7000 сяброў і 10 000 прыхільнікаў ТБМ. Мы разумеем, што не кожны той, хто лічыць сябе сябрам ТБМ можа актыўна працаваць у Таварыстве, але газету выпісаць можа кожны. Гэта ёсць рэальная дапамога ў нашай працы.

Ліпень Кастрычнік

Берасцейская вобласць:		
Баранавічы р.в.	22	30
Бяроза р.в.	5	12
Белаазёрск р.в.	1	1
Бярэсце гор.	33	20
Ганцавічы р.в.	1	-
Драгічын р.в.	2	2
Жабінка р.в.	-	1
Іванава р.в.	-	3
Івацэвічы р.в.	1	2
Камянец р.в.	7	25
Кобрын гор.	13	12
Лунінец гор.	3	4
Ляхавічы р.в.	1	1
Маларыта р.в.	-	2
Пінск гор.	57	34
Пружаны р.в.	3	6
Столін р.в.	4	2
Усяго:	**153**	**157**
Віцебская вобласць		
Бешанковічы р.в.	3	2
Браслаў р.в.	1	2
Віцебск гор.	21	23
Віцебск РВПС	1	1
Верхнедзвінск р.в	-	8
Глыбокае р.в.	4	5
Гарадок р.в.	3	3
Докшыцы р.в.	3	3
Дуброўня р.в.	2	3
Круляўшчызна	2	2
Ліёзна р.в.	-	4
Лепель р.в.	-	1
Міёры р.в.	5	6
Наваполацк гор.	18	13
Ворша гор.	9	10
Полацк гор.	42	88
Паставы р.в.	5	6
Расоны р.в.	-	1
Сянно р.в.	1	2
Талочын р.в.	2	4
Ушачы р.в.	1	1
Чашнікі р.в.	3	1
Шаркоўшчына р.в.	11	9
Шумініна р.в.	2	1
Усяго:	**139**	**199**
Менская вобласць		
Беразіно р.в.	3	3
Барысаў гор.	12	11
Вілейка гор.	4	1
Валожын гор.	12	11
Дзяржынск р.в.	2	4
Жодзіна гор.	7	11
Клецк р.в.	2	3
Крупкі р.в.	-	1
Капыль р.в.	1	2
Лагойск р.в.	3	3
Любань р.в.	4	5
Менск гор.	368	455
Менск РВПС	2	13
Маладзечна гор.	19	21
Мядзель	8	22
Пухавічы РВПС	14	16
Нясвіж р.в.	1	3
Смалявічы р.в.	1	1
Слуцк гор.	8	11
Салігорск гор.	5	12
Ст.Дарогі р.в.	1	1
Стоўбцы р.в.	5	5
Узда р.в.	1	-
Чэрвень р.в.	5	5
Фаніпаль	1	1
Усяго:	**489**	**621**

Ліпень Кастрычнік

Гомельская вобласць:		
Буда-Кашалёва	-	1
Брагін р.в.	1	1
Ветка р.в.	1	2
Гомель гор.	34	47
Гомель РВПС	1	1
Добруш р.в.	4	3
Ельск р.в.	2	-
Жыткавічы р.в.	36	39
Жлобін гор.	4	5
Калінкавічы гор.	2	1
Карма р.в.	-	2
Лельчыцы р.в.	1	1
Лоеў р.в.	-	1
Мазыр гор.	4	7
Акцябарскі р.в.	4	7
Нароўля р.в.	-	1
Петрыкаў р.в.	1	3
Рэчыца гор.	2	2
Рагачоў гор.	1	1
Светлагорск гор.	3	4
Хойнікі р.в.	-	1
Чачэрск р.в.	-	2
Усяго:	**101**	**132**
Гарадзенская вобласць		
Бераставіца	2	3
Ваўкавыск гор.	14	13
Воранава р.в.	4	5
Горадня гор.	139	119
Горадня РВПС	32	29
Дзятлава р.в.	6	8
Зэльва р.в.	5	5
Іўе р.в.	1	3
Карэлічы р.в.	3	5
Масты р.в.	9	7
Навагрудак гор.	7	8
Астравец р.в.	4	5
Ашмяны р.в.	10	12
Смаргонь гор.	7	9
Слонім гор.	12	9
Свіслач р.в.	2	4
Шчучын р.в.	7	3
Ліда	19	30
Усяго:	**283**	**280**
Магілёўская вобласць		
Бабруйск гор.	18	26
Бабруйск РВПС	-	-
Бялынічы р.в.	1	2
Быхаў р.в.	1	2
Глуск р.в.	1	-
Горкі гор.	12	12
Дрыбін р.в.	-	1
Кіраўск р.в.	-	1
Клічаў р.в.	-	1
Краскаполле р.в.	-	1
Крычаў	-	1
Клімавічы р.в.	8	4
Касцюковічы р.в.	1	1
Круглае р.в.	5	5
Мсціслаў р.в.	3	1
Магілёў гор.	15	20
Магілёў РВПС	-	-
Асіповічы гор.	9	12
Слаўгарад р.в.	2	1
Хоцімск р.в.	-	1
Чэрыкаў р.в.	37	3
Чавусы р.в.	-	1
Шклоў р.в.	5	4
Усяго:	**118**	**100**
Усяго па краіне	**1283**	**1489**

Грамадскае аб'яднанне
"Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны"
220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13, тэл/факс 284-85-11

Разліковы рахунак № 30120018240001 у Гарадскім аддз. Белэкспрэсбанку г. Мінску, код 764

Спадару Чыкіну В. В., Старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, 220807, г. Менск, вул. Макаёнка, 9

Паважаны Віктар Валянцінавіч!

Мусім звярнуць Вашу ўвагу на тое, што апошнім часам у інфармацыйных праграмах АТН усё часцей з'яўляюцца рэпартажы на рускай мове. Такога не было нават за савецкім часам, бо кіраўніцтва краіны і тэлебачання выдатна разумела, што гэта адзіны інфармацыйны тэлеканал на мове тытульнай нацыі, і рупілася пра забеспячэнне, хоць бы вонкава, нацыянальных правоў жыхарства рэспублікі.

Просім патлумачыць, чаму штодзельная аналітычная праграма "Рэзананс" выходзіць у эфір па-руску, хаця вядучы праграмы, Ваш намеснік спадар Зімоўскі валодае беларускай мовай. Падобныя аналітычныя праграмы выходзяць у гэты вечар па расійскіх тэлеканалах і, зразумела, на рускай мове. Атрымліваецца, што беларусу ў нядзелю вечарам аніяк немагчыма пачуць роднай мовы з экрана тэлевізара. І гэта знаходзячыся не ў эміграцыі, а жывучы ў роднай краіне!

Просім таксама паведаміць, чаму ўсе мультыплікацыйныя стужкі, што дэманструюцца на нацыянальным тэлеканале, дагэтуль не дублююцца па-беларуску. Таварыства беларускай мовы можа перадаць Беларускаму тэлебачанню мультфільмы, дубляваныя па-беларуску студэнтамі і акторамі менскіх тэатраў уласным коштам на грамадскіх пачатках. Ці не падаецца Вам дзіўным, што ў студэнтаў з іх невялікімі стыпендыямі і беларускіх актораў з іх жабрачымі заробкамі знаходзяцца сродкі і магчымасці, каб агучыць гэтыя стужкі, а ў адзінага ў краіне нацыянальнага тэлеканала сродкаў на такую важную справу чамусьці не стае. І гэта ў той час, як на стварэнне нізкага ўзроўню калек з расійскіх праграм беларускае тэлебачанне грошай не шкадуе. Няўжо беларускія дзеткі так і не дачакаюцца з экрану тэлебачання мультфільмаў па-беларуску, гадуючыся ў суверэннай Беларусі!

А па станоўчыя прыклады ў вырашэнні нацыянальнага пытання далёка хадзіць не трэба. Ува Украіне нават ні на адным з мясцовых тэлеканалаў, не кажучы ўжо пра нацыянальныя. Вы не пабачыце ані серыялу, ані якога іншага фільму, каб ён не быў падубляваны на ўкраінскую мову. А эканамічны стан гэтай краіны нельга лічыць добрым.

Такім чынам, Таварыства спадзяецца, што Вы, шаноўны спадар Чыкін, абавязкова выправіце такую прыкрую сітуацыю, што існуе зараз на нацыянальным тэлеканале, і паспрыяеце забеспячэнню канстытуцыйнага права беларускіх грамадзян на атрыманне інфармацыі на іх роднай, а разам з тым і дзяржаўнай беларускай мове, і менавіта пад Вашым кіраўніцтвам беларуская мова ўсё ж атрымае зялёнае святло на адзіным тэлеканале краіны, каб ён меў сапраўднае права звацца нацыянальным.

З павагай старшыня ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" Алег Трусаў.

Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь

Национальная государственная телерадиокомпания Республики Беларусь

220807, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Макаёнка, 9

220807, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, вул. Макаёнка, 9

Старшыні ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны" А.А. Трусаву

Паважаны Алег Анатольевіч!

У сувязі з Вашым пісьмом ад 30 жніўня 2000 года № 572 мушу нагадаць Вам, што беларускі народ на адпаведным рэферэндуме вырашыў размаўляць, чытаць, спасцігаць здабыткі сваёй і сусветнай культуры на дзвюх мовах.

Каб чуць беларускую мову з экрана Беларускага тэлебачання - раю Вам глядзець не толькі нядзельныя перадачы А. Л. Зімоўскага.

Што да Вашай прапановы аб перадачы Беларускаму тэлебачанню мультфільмаў, то мы згодны купіць іх, калі Вы гарантуеце, што яны агучаны на літаратурнай беларускай мове і адпавядаюць агульнапрызнаным нормам якасці.

З павагай Старшыня Белтэлерадыёкампаніі В. В.Чыкін.

Грамадскае аб'яднанне
"Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны"
220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13, тэл/факс 284-85-11

Разліковы рахунак № 30120018240001 у Гарадскім аддз. Белэкспрэсбанку г. Мінску, код 764

Спадару В.Стражаву міністру адукацыі Беларусі # 9 Савецкая 220010 Мепск

Паважаны Васіль Іванавіч!

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" апошнім часам усё часцей атрымлівае сведчанні пра нізкую якасць падрыхтоўкі выпускнікоў сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў краіны па беларускай мове ды іншых гуманітарных дысцыплінах. Гэтая ж праблема закранаецца і ў лісце старшыні Белтэлерадыёкампаніі сп. Віктара Чыкіна, што яшчэ больш пераконвае нас у надзвычайнай патрэбе Беларусі мець Беларускі нацыянальны універсітэт з выкладаннем усіх дысцыплінаў па-беларуску.

Аднак ужо сёння ў нашай краіне можна палепшыць стан валодання роднай, а між тым і дзяржаўнай, мовай. У звязку з гэтым ТБМ звяртаецца да Вас з шэрагам прапаноў:

- Увесці гэму "Арфаэпія" у праграму пачатковых і 5-6 класаў прыступкавым прынцыпам з абавязковым дубляваннем гэтай найважнейшай тэмы ў падручніку на працягу 3-4 параграфаў;

- Увесці абавязковы іспыт па беларускай мове за курс сярэдняй школы і дзяржаўны іспыт – на ўсіх гуманітарных факультэтах ВНУ;

- Аднавіць курс беларусазнаўства для негуманітарных спецыяльнасцяў ва ўсіх ВНУ;

- Адкрыць шэраг курсаў па вывучэнні беларускай мовы для жыхароў краіны розных устаноў, асабліва для супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў, якія паводле Закона аб мовах мусяць валодаць дзяржаўнай беларускай мовай;

- Увесці ў сістэму кваліфікацыйных іспытаў для супрацоўнікаў дзяржустаноў іспыт па беларускай мове.

З павагай.

Старшыня ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" Алег Трусаў.

Мае развагі

Як ні сумна азначыць, але справа з іншамоўна-беларускімі і беларуска-іншамоўнымі слоўнікамі пры незалежнасці, як і пад савецка-расейскай акупацыяй, застаецца той жа: іх папросту няма. То бо, яны, як бы ёсць тэарытычна, але практычна, у кнігарні, вы іх не ўбачыце.

Зноў, як і пад савецкай акупацыяй, нашыя школьнікі мусяць вывучаць англійскую, іспанскую, нямецкую ды французскую мовы праз каланіяльную расейскую. Праўда, у падручніках, прызначаных для школ з беларускай мовай навучання ёсць маленькія слоўнічкі, дзе іншамоўныя словы пададзены па-беларуску, але яны складзены не надта ахайна, яўна з агляду-каю на расейскую мову і да таго ж вельмі маленькія. А паколькі зараз ідзе працэс лінгвістычнай "зачысткі" Беларусі, то і такія "турботныя" падручнікі і слоўнічкі пры іх паступова знікаюць.

У сённяшняй Беларусі беларусу нельга прыдбаць нічога каб вывучаць чужыя мовы, альбо чытаць іншамоўны тэкст непасрэдна праз беларускую мову. Слоўнікавы рынак слугуе толькі "рускаязычных".

Слоўнікаў з іншых моваў на беларускую існуе вельмі небагата і саміх моваў таксама мала. Беларуска-іншамоўных слоўнікаў шчэ меней, таму няма як прадстаўляць нашую мову лінгвістычнаму і проста цікаўнаму грамадству. Гэта праблема, якая чакае пільнага вырашэння.

Мой лексікаграфічны досвед паказвае, што складанне слоўнікаў патрабуе часу, ведаў, энтузіястычнасці, нацыяналістычнасці ды аптымізму.

Пачалося ўсё з таго, што, чым болей я выкладаў замежную мову, тым меней натуральным здавалася мне тое, як я гэта раблю. Я маю на ўвазе каланіяльны спосаб, праз расейскую. Урэшце, неяк з першага верасня, ужо і не памятаю з якога году, я пачаў вучыць дзетак праз беларускую. Справа была настолькі незвычайная, што, дазнаўшыся пра тое праз некалькі тыдняў, завуч ажно тры дні запар хадзіў да мяне на ўрокі, а потым сказаў: - А як жа ты будзеш вучыць? На беларускую ж не перакладаецца. – Чалавек – сам беларус – так прызвычаіўся да расейшчыны, што нават не думаў, што на беларускую, як і на ўсякую іншую, можна перакласці. Мне потым казалі, што я быў адзіным настаўнікам замежнай мовы на Беларусі, хто не парушыў моўны рэжым. Хто яго ведае, мо і так.

Але справа не ў гэтым. Хто кажа "а" мусіць сказаць і "б". Давялося ўзяцца за складанне слоўнікаў. Калі хто-небудзь са знаёмых дазнаваўся, чым я займаюся, то з жалем пытаў, навошта гэта. І, шчыра кажучы, я не мог знайсці трапны аргумент. Гэта пытанне, як: навошта вам дзіця, калі ўжо ёсць на свеце досыць дзяцей.

Між складзеных і нідзе не надрукаваных – а, значыць, віртуальных слоўнічкаў, ёсць італьянска-беларускі, тысяч на 11 словаў. У свой час яго мелася выдаць адно патрыятычнае выдавецтва, слоўнік адрэгавалі, набралі на кампутары, але далей працэс "павіс".

Складаў я яго з вялікім энтузіязмам, бо мне падабаецца італьянская мова, у свой час менавіта з італьянскіх газет, якія нейкім дзівам прадаваліся ў Менску, я даведаўся шмат пра тое, чаго век не прачытаў бы ў савецка-камуністычным друку. Шкада, што і дагэтуль мы не маем дасяжнага італьянска-беларускага слоўніка.

Калі зараз заходзіць гаворка пра слоўнік то ў мяне доКі зазвычай пытаюць, дзе я браў найбольш частотныя словы. Скажу адразу – нідзе. Бо слоўнікавы рынак, спрэс апанаваны расейшчынай, вельмі бедны. На ім нічога сур'ёзнага нельга купіць. Толькі ў двух выпадках – іспанска-беларускім і італьянска-беларускім – я скарыстаў спіс найбольш частых словаў. У іншых выпадках даводзіцца абапірацца на свой лінгвістычны досвед і разважны розум. Да таго ж увесь час, складаючы слоўнік, думаеш, ці варта ставіць у яго тое ці іншае слова, прыслухоўваючыся да радыё, прыкідваеш гэта чытаючы газету. Словам, стала жывеш у лінгвістычным асяроддзі.

У лексіграфічнай справе асабліва шкодзіць рыгарыстычны падыход. Што ні кажы, а нашы рэдактары ўсё шчэ жывуць пад чарамі расейскай лексікаграфіі, бо іншых моваў, нажаль, не ведаюць. Адзін мой слоўнік падмеліся выпусціць, нават абвестку надрукавалі, пачалі рэдагаваць. Якім жа было маё здзіўленне, калі я ўбачыў на стале рэдактаркі побач з маім слоўнікам расейскі, да слова, састарэлы, хоць і найноўшага на той час выдання. Я ведаю ўсе гэтыя чатыры мовы, але кантраляваць беларускі слоўнік праз расейскі – дурнота. Я зразумеў, што маёй працы хана. Хана прышла з беларускага боку, калі высокалобыя хлопцы напісалі доўгае глупства пад назовам "рэцэнзія". Самі хлопцы для беларускай лексікаграфіі нічога не зрабілі, але ідэю зарэзалі. Зараз той слоўнік – 6 тоўстых папак – збірае пыл на шафе.

Вельмі крыўдна, што нашыя беларускія дзеці не маюць, адмысловых слоўнічкаў па замежных мовах. Для навучання мовам патрэбныя невялікія слоўнікі, каб вучань мог хутка знайсці слова. Ёсць у нас іспанска-беларускі ды беларуска-іспанскі слоўнічак для школьнага ўжытку (абодва маюць каля чатырох тысяч словаў, што зусім дастаткова для паразумення). Летась гуртам мы выдрукавалі на друкарцы беларуска-нямецкі слоўнічак, нажаль, усяго толькі некалькі асобнікаў для сябе. Пад канец году я зрабіў беларуска- партугальскі ды партугальска-беларускі слоўнічкі. Можа падацца, што партугальская мова ў Беларусі нешта вельмі экзатычнае. Гэта недасведчаным так здаецца, хто ведае мовы, таму экзатычных моваў няма. Мне трошкі шкада, што для мяне прапаў флёр таямнічасьці многіх еўрапейскіх моваў. Хай бы гэты флёр прапаў і для маіх суайчыннікаў.

А тым часам у школах замежная мова на правах другараднага прадмету. Мяркуйце самі, у пятым класе на расейскую мову і літаратуру ідзе пяць гадзін, на замежную - толькі тры.

Практычна адзін дзень у тыдзень нашыя вучні вучаць тое, што і без таго добра ведаюць. Мне шчэ ніхто не жаліўся, што не разумее расійскага мульціка. Словам, дзень з тыдня марнуецца на русіфікацыю. Між тым павелічэнне колькасці часу на вывучэнне замежных моваў праз беларускую спрыяла б, як беларусізацыі, гэтак і еўрапеізацыі нашага юнацтва, падвышала б ягоны культурны статус. Але не забудзем, што ў нас на адукацыю ідзе 6,6% УВП, у маленькай Даніі – з Гомельскую вобласць! – ажно 20%!

Нашыя настаўнікі нічым не горшыя за замежныя. Мы проста бедныя. Нашыя дзеці кемлівыя і таленавітыя. Ім не пашчасціла нарадзіцца ў багатай краіне. Дык ці да слоўнікаў тут? Так, і да слоўнікаў!

Наперадзе шмат працы. Ляжаць рэестры новагрэцка-беларускага слооўніка, дацка-беларускага ды шведска-беларускага слоўнічкаў. Ляжыць непакладзены на беларускую мову Джаванні Бакачча. Трэба працаваць не зважаючы ні на якія "інтэграцыі", ні на якую каньюнктуру, бо "жыў беларус і будзе жыць".

Так што хто ведае мовы, хай бярэцца хоць бы за маленькую справу. Вось адзін мой сябар склаў невялікі, але дастатковы ірландска-беларускі ды беларуска-ірландскі слоўнік.

Файна.

Жыве Беларусь!

Мікола Бусел, настаўнік.

Кастусь Тарасаў

Апошняе каханне князя Міндоўга

Аповесць

Палова 13-га стагоддзя. Самы значны час беларускай мінуўшчыны – гадзіна стварэння новай дзяржавы, аб'яднанай вакол Наваградскага княства. На заходніх межах пачынаюць наступ крыжакі Тэўтонскага ордэну, з усходу пагражае татарскае нашэсце. Небяспека патрабуе супольнага адпору заваёўнікам, неабходнасці моцнай улады на беларускіх і літоўскіх абшарах. На чале аб'яднання стаў старажытны Наваградак. Запрошаны сюды на княжанне таленавіты войскаводзец князь Міндоўг, родавае гняздо якога было на Ашмяншчыне, пачынае пашыраць межы дзяржавы – праз захопы, гвалт, падпарадкаванне і вынішчэнне іншых князёў. Стварэнню Наваградскай дзяржавы супрацьдзейнічаюць галіцка-валынскія князі, крыжакі Лівонскага ордэну, мазуры, удзельныя князі, якія намагаюцца захаваць самастойнасць.

За 15 гадоў Міндоўг здолеў перамагы ўсіх сваіх ворагаў і надаць Наваградскай дзяржаве нязломную ўжо моц. Зайздрасць князёў, змовы, бясконцыя войны, наезды, замахі на жыццё, штодзённая рызыка – у гэтакай атмасферы праходзіць век Міндоўга, і да такога жыцця князь рыхтуе сваіх малодшых сыноў. Ён прымае хрышч, яму і ягонай жонцы прывозяць у Наваградак каралеўскія кароны. Адкінуўшы высокія рэгаліі, Міндоўг ачольвае паўстанне супраць Ордэну. Смерць жонкі прыносіць яму адзіноту. Запалены новым каханнем, 60-гадовы Міндоўг разбурае сям'ю свайго пляменніка, нальшчанскага князя Даўмонта, гвалтам пакідае пры сабе яго маладую прыгожую жонку, сястру памерлай жонкі. Жарсці, якія заханілі гэтых людзей, вядуць да трагічнай развязкі – Даўмонт вынішчае ўвесь род свайго крыўдзіцеля. Тады помсціць за бацьку выходзіць з манастыра старэйшы сын Міндоўга, князь Войшалк. Шэраг крывавых забойстваў, бязлітаснае змаганне за ўладу паміж рашучымі жорсткімі князямі адкрывае хроніку шматвяковай гісторыі нашай дзяржавы – ВКЛ.

Усе, хто пажадае ўдзельнічаць у супольнай фундацыі выдання аповесці пра беларускую даўніну, маюць скантактавацца з ТБМ імя Францішка Скарыны, якое апякуе гэты праект (тэл. 284-85-11 Алег Трусаў), ці з аўтарам (тэл. 239-46-87, увечары, Кастусь Тарасаў)

Вандроўка ў Кушляны

9 верасня кніжны клуб ТБМ з яго старшынем Змітром Ціхановічам зрабіў вандроўку па мясцінах Францішка Багушэвіча.

Наведалі яго сядзібу музей у Кушлянах, касцёл, у якім усталявана мемарыяльная дошка паэту, яго магілу помнік у Жупранах. Жадаючыя сфатаграфаваліся ля каменю Мацея Бурачка. Фатаграфаваў удзельнік вандроўкі Алесь Стральцоў. Вяртаючыся ад Багушэвіча, завіталі ў Ашмяны ды да Агінскіх у Залессе.

У вандроўцы прынялі ўдзел Уладзімір Содаль, Валянціна Аксак, Уладзімір Арлоў, Ірына Марачкіна, Мікола Лавіцкі, Людміла Сільнова

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ СЁННЯ

І зрабіў тады Пан Бог людзей рознамоўнымі, каб упарадкаваць іх жыццё, узбагаціць дух, навучыць жыць разам у згодзе, але кожны народ самастойна і незалежна.

Са старажытнасці і да нашых часоў асноўнае гістарычнае прызначэнне дзяржавы гэта рэалізацыя інтарэсаў пэўнай нацыі або нацыянальнасці. Калі гэта прызначэнне выконваецца у малой ступені, то маем прыклады дзяржаў-марыянетак, калоній або паўкалоній. Калі гэта прызначэнне гіпертрафуецца, то з'яўляюцца дзяржавы імперыі, якія за кошт жыццёвых інтарэсаў залежных нацый задавальняюць патрэбы дамінантнай нацыі.

Кожная нацыя – літоўцы, палякі, украінцы, французы і г.д. – мае адпаведнае дзяржаўнае прадстаўніцтва, якое ўвасабляе гістарычную пераемнасць развіцця нацыі, яе мову, культуру. У беларусаў такой дзяржаўнай падтрымкі няма. Дзяржава знаходзіцца ў апазіцыі да беларусаў. І па форме і па зместу яна выказвае інтарэсы фінансавай алігархіі і ваенна-прамысловага комплексу, зацікаўленых у русіфікацыі беларусаў, іх палітычнай і эканамічнай залежнасці ад Расіі. У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь ад 24.11.96 г. не ўжываюцца паняцці беларускі народ, беларус, або беларускі. Але і гэта Канстытуцыя парушаецца як па артыкулам так і вогуле.

Гістарычнае прызначэнне беларускай дзяржавы гэта захаванне і развіццё беларускага народа, яго эканомікі, адукацыі, культуры, беларускай мовы. Гэта не азначае, што беларус не ведае і не карыстаецца іншымі мовамі і культурамі. Але гэта азначае, што дзяржаўныя ўлады павінны несці адказнасць за стварэнне пэўнага беларускамоўнага асяроддзя, дзяржаўным асобам належыць звяртацца да насельніцтва на беларускай мове, а таксама весці на ёй дакументацыю і справаздачы.

На дзяржаўным беларускім радыё па-беларускі павінны размаўляць не толькі дыктары ды наменклатурныя радыёстукачы, якія апошнім часам (другая палова 1999 г.) лічаць асаблівым шыкам на беларускай мове зневажаць прадстаўнікоў БНФ і іх прыхільнікаў, заклікаюць паставіць гэных "апазіцыянераў" да сценкі або саслаць іх у родную Сібір і такім чынам забяспечыць грамадзянскую згоду і непахісныя ўстоі правячых колаў. Напрыклад, такі ўзровень ідэалагічнага забяспячэння стала дэманструе перадача "Размова па сутнасці", вядучая Чайка.

Дарэчы гэта асоба заклікае да прыняцця праваслаўя ў якасці дзяржаўнай ідэалогіі Беларусі (Расіі). Апошняе, разам з адаптаваным беларусамі расійскім матам, на думку архітэктараў дзяржаўнага будаўніцтва і сацыябіяпраграмістаў, будзе спрыяць стварэнню новай супольнасці, новай нацыі, якая а ні руская, а ні беларуская, заўсёды пакорная і задаволеная, усім удзячная, праграмуемая і прагназуемая ва ўсім, без праблемаў і недарэчных пытанняў.

Трэба прызнаць на дзяржаўным і заканадаўчым узроўні палітыку русіфікацыі насельніцтва Беларусі злачыннай, накіраванай на ліквідацыю беларускага народа і заменай яго замбіраваным русіфікаваным насельніцтвам . не маючы пачуцця нацыянальнай годнасці і тым самым паступовай стратай беларускай дзяржаўнасці.

Беларусь мае права слухаць сваё дзяржаўнае радыё, тэлебачанне на беларускай мове, атрымліваць адукацыю ад пачатковай да найвышэйшай на беларускай мове, мець беларускамоўнае асяроддзе а таксама мае права і гонар лічыць сябе беларусам, прымаць удзел у будаўніцтве незалежнай Беларусі. Мы – не рабы, рабы – не мы. Сучаснаму чалавеку не патрэбны ўлады, якія існуюць дзеля ўласнага задавальнення, нездольныя выконваць сацыяльныя функцыі, ускладзеныя на іх грамадствам і законам.

Беларус мае права быць беларусам. Ён мае права выбару, але ці будзе выбар у беларусаў у выбарах, якія павінны адбыцца, ва ўмовах якія склаліся на Беларусі сёння? Ці будзе заўтра ў баларусаў?

Самко Галіна.

"Ад лідскіх муроў" № 4

У Лідзе выйшаў чацвёрты нумар літаратурнамастацкага часопіса "Ад лідскіх муроў". Рэдактарам гэтага нумара часопіса выступае паэт Юры Карэйва. У часопісе сабраныя паэтычныя празаічныя творы 20 аўтараў. Пачынаючы з гэтага нумара тут больш не друкуюць усіх у алфавітным парадку, а выбіраюць найбольш дасканалыя творы. А пачынаецца нумар радкамі Пятра Макарэвіча:

Уставай, суайчыннік,
з каленяў!
Не трусь!
Годзе свет нам смяшыць
І гібець, як папала!
Беларускае Слова –
жыве!
І жыве Беларусь!
Ёсць Скарына у нас,
Багдановіч,
Купала...

"Уздоўж Бесядзі"

"Уздоўж Бесядзі" – такую назву атрымала новая экспазіцыя Веткаўскага музея народнай творчасці, філіял якога знаходзіцца ў Гомелі.

Выстава – вынікі экспедыцыі супрацоўнікаў музея гэтым летам па тэрыторыі Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Акрамя жаночага сялянскага адзення тут прадстаўлены ручнікі і іншыя прадметы быту.

На здымку: экспазіцыю прадстаўляе супрацоўніца музея Алена Канавалава

Фота Сяргея Халадзіліна БелТА.

№ 40 (477) 11 КАСТРЫЧНІКА 2000 г. Наша слова

В. І. Саітава

Шлях да Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак ў папярэднім нумары).

Аснову фонду гэтых разделаў склалі прадстаўленыя ў цэнзуру экземпляры кніг і другіх дакументаў ад пачатку 19 ст. да паўстання 1863 г., якія паходзілі з архіву вядомай віленскай друкарні Завадскага. Куплены былі Т.Урублеўскім у Варшаве у складзе багатай бібліятэкі Ю.Бялінскага Вядома, што аўтары гэтага часу з усёй Беларусі выпускалі свае выданні ў гэтай друкарні. Набытыя былі Т.Урублеўскім славутыя кнігазборы Генрыка Плятара, памешчыка з Ігуменскага павету, археолага-аматара і вядомага збіральніка каштоўнасцяў Генрыка Татура, масонская бібліятэка віцебскага адваката Вацлава Федаровіча. У гэтых бібліятэках меліся каштоўныя беларускія кнігі і рукапісы, замежныя выданні і рукапісы з унікальнай інфармацыяй аб Беларусі. Падчас шматгадовых ваенных падзеяў Т.Урублеўскі сабраў усе ўлёткі, якія тычыліся Вільні і краю, здабываў архіўныя і рукапісныя матэрыялы гэтай жа тэматыкі. Ён атрымліваў у бібліятэку каштоўныя дары ад вядомых вучоных, чыноўнікаў, напрыклад, праф. З. Юндзіла, А. Вашкевіча, А. Войніча і інш., асобныя экземпляры перадаваліся ўладальнікамі ў бібліятэку на працяглае захаванне.

Захавалася шмат спасылак на выяўленне літаратуры па каталогах Публічнай бібліятэкі, выкарыстанне яе фондаў. З розных куткоў Беларусі ехалі мясцовыя аматары старажытнасцяў, краязнаўцы, надрукаваныя творы якіх сталіся вынікам працы ў Публічнай бібліятэцы. Карыстальнікам бібліятэкі былі вядомыя польскія гісторыкі, якія асвятлялі праблемы беларусазнаўства. Сам Т. Урублеўскі на той час меў славу "самага працавітага і найсумленнейшага бібліятэкара, уражваў эрудыцыяй і памяццю бібліёграфа" (3). У 1913 г. фонд Публічнай бібліятэкі склдаўся з 65000 тамоў твораў, звыш за 1000 карт і планаў, 3000 гравюр, каля 5000 тысячаў рукапісаў, звыш за 10000 дакументаў, лістоў і аўтографаў, калекцыі партрэтаў, медалёў, разьбы і іншых каштоўнасцяў, якія ацэньваліся на суму 40000 расійскіх рублёў. У 1913 і 1915 г.г. Т. Урублеўскі купіў пляц і дом, які пачалі перабудоўваць пад бібліятэку. Першая сусветная вайна перапыніла гэту працу і будынак быў завершаны толькі ў 1922 г. Аднак самае важнае, што ў цяжкіх матэрыяльных і палітычных умовах Т. Урублеўскі здолеў зберагчы бібліятэку. У гэты час Вільня апынулася ў складзе Другой Рэчы Паспалітай Польскай і Т. Урублеўскі спадзяваўся на дзяржаўную падтрымку. Аднак адноўленая краіна мела велізарную колькасць другіх неадкладных праблем, не спяшаліся на дапамогу і гарадскія ўлады, і ў апошнія гады жыцця Т. Урублеўскі, пацярпеўшы фінансавыя страты ў выніку вайны, як мог, змагаўся за выжыванне Публічнай бібліятэкі. Ён змяніў профіль Таварыства, якое атрымала назву "Таварыства навуковай дапамогі імя Я. і Э. Урублеўскіх" (1922 г.), што мела адлюстраваць грамадскую ролю бібліятэкі. На чале Таварыства стаяў камітэт з 9 сяброў, у якім абавязкам самога Т. Урублеўскага было быць захавальнікам збораў. Бібліятэчная і музейная калекцыі яшчэ больш выраслі: напачатку 1925 г. налічвалася 80534 тамоў твораў друку (без уліку дублетных асобнікаў), звыш дзесяці з паловай тысячаў гравюр, звыш 28000 рукапісаў, лістоў, старажытных актаў, 1474 карт, 407 пячатак, 2472 фотаздымкаў, 202 медалі і медальёны і шмат іншых дакументаў. У гэты час у Вільні была створана суполка Саюза польскіх бібліятэкараў і Т. Урублеўскі стаў яе сябрам. На адным з пасяджанняў ім быў зроблены навуковы даклад па тэме "Аб арганічных і неарганічных шкодніках кніг". Можна адзначыць, што праблема зберажэння фондаў у тым ракурсе, у якім яе распрацаваў Т.Урублеўскі, з'яўляецца актуальнай для сучаснай бібліятэчнай справы.

Пастаянна займаўся Т. Урублеўскі і бібліяграфічнай працай. Ён каталагізаваў зборы бібліятэкі, дапамагаў многім бібліяграфічнымі даведкамі і парадамі. Яму таксама належыць 5 рукапісных бібліяграфічных дапаможнікаў. Сярод іх: "Паказальнік выданняў, забароненых у Расіі ў перыяд ад 1905 да 1915 году на польскай, літоўскай і беларускай мовах і прысвечаных Польшчы, Літве і Беларусі", два спісы выданняў, не адзначаных у рэтраспектыўных паказальніках К. Эстрэйхера, "Алфавітны паказальнік Урадавага весніка грамадзянскага праўлення Усходніх зямель 1919-1920.", паказальнік псеўданімаў.

Польскі ўрад прыйшоў на дапамогу Публічнай бібліятэцы ўжо пасля смерці яе заснавальніка. Міністэрства веравызнанняў рэлігійных і народнай асветы набыло для бібліятэкі былы палац Тышкевіча (на збегу вуліц Арсенальнай і Жыгімонтаўскай), прафінансавала рамонт. У 1926 г. камітэт перадаў ураду права фундацыі Публічнай бібліятэкі на ўмовах вечнага дыепазыту. Урад таксама ўзяў на сябе абавязак захоўваць цэласнасць яе фондаў і знаходжанне іх толькі на тэрыторыі Вільні.

Значэнне Публічнай бібліятэкі ў навуковым і культурным жыцці Вільні і ўсёй Заходняй Беларусі яшчэ больш узмацнілася. Яна была адным з цэнтраў бібліятэчна-інфармацыйнага забяспечання польскіх, беларускіх, літоўскіх даследчыкаў, вывучаючых мінулае Вялікага Княства Літоўскага. Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, праблем паланістыкі, беларусістыкі, літуанікі, агульнадаступнай бібліятэкай. Сярод яе каталогаў быў каталог рэгіянальных выдавецтваў, у якім была адлюстравана і прадукцыя выдавецтваў, размешчаных на беларускай тэрыторыі (2).

Вядома, што ў гэты ж час у Вільні працаваў славуты Беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя Івана Луцкевіча, які таксама меў выдатны кнігазбор. Адносіны паміж гэтымі буйнейшымі культурнымі цэнтрамі відаць былі не простымі. Можна спаслацца на факт судовага працэсу, у выніку якога Публічная бібліятэка імя Я. і Э. Урублеўскіх адсудзіла з музею 36 выданняў і 11 рукапісаў. Аднак незалежна ад канкрэтных сітуацый у міжваенны час у Вільні дзякуючы энтузіазму, эрудыцыі і нястомнай працы выдатных людзей існавалі бібліятэкі і музейныя калекцыі, якія мелі надзвычайную каштоўнасць для беларускага народа. Тым цяжэй канстатаваць, што гэтыя выдатныя культурныя цэнтры страчаны для беларусаў. Памяць жа аб здабытках такіх дзеячаў, якім быў Тадэвуш Урублеўскі, павінна быць часцінкай нацыянальнай свядомасці нашага народу.

Ці быў беларускі рух у расейскім флоце?

Так, паводле наяўных звестак, гэты рух быў у 1917 – 1918 г.г. у расійскім Балтыйскім флоце.

Пасля звяржэння самаўладства ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г., нягледзячы на імкненне Часовага Ураду захаваць "адзіную і непадзельную Расію", на тэрыторыі былой Расійскай імперыі развіваўся рух за незалежнасць, федэрацыю, аўтаномію шматлікіх народаў. У кароткі час на тэрыторыі Беларусі, а таксама ў Петраградзе, Маскве і іншых расійскіх гарадах, дзе было нямала беларусаў – уцекачоў, рабочых, жаўнераў і матросаў, узнікла мноства нацыянальных арганізацый, гурткоў, суполак і згуртаванняў.

Першыя гурткі беларусаў-вайскоўцаў, як вядома, паўсталі ў траўні 1917 г. з ініцыятывы і нацыянальнага пачуцця паасобных афіцэраў і жаўнераў, што адчувалі і добра разумелі безадкладную патрэбу самаарганізацыі ўсіх беларусаў, дзе б яны ні былі. Амаль адначасова ў Балтыйскім флоце разгарнуў працу матрос Васіль Муха, які ў чэрвені 1917 г. заснаваў арганізацыю "Маракоў-беларусаў Балтыйскага флоту", прыцягнуўшы да яе і генера-маёра К. А. Аляксееўскага ў Выбаргу. У хуткім часе, да пачатку снежня 1917 г., было моцна зарганізавана больш за 800 матросаў, звязаных "агульным жаданнем пастаяць за родную Беларусь". На жаль, гісторыя гэтай арганізацыі пакуль мала даследавана. Лепш вядома біяграфія яе заснавальніка.

Васіль Муха

Васіль Муха нарадзіўся 25 лютага 1889 г. у вёсцы Андрэеўка Рэчыцкага павету Менскай губерні (цяпер Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці) у сялянскай сям'і. Скончыў Маладушскую народную вучэльню (Рэчыцкі павет). У 1910 г. прызваны на флот, дзе скончыў яшчэ школу радыётэлеграфістаў у Кранштадце. У 1-ю сусветную вайну знаходзіўся на баявых караблях Балтыйскага флоту ў службе сувязі. З сакавіка 1917 г. член Абласнога камітэта арміі, флоту і рабочых Фінляндыі. Дэлегат 3-га з'езду Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ; Менск, кастрычнік 1917 г., абраны ў склад ЦК). Адначасова лічыўся левым эсэрам. Быў таварышам (па-сучаснаму, намеснікам) старшыні з'езду воінаў-беларусаў Заходняга фронту, прадстаўнікоў беларускіх арганізацый 12-й арміі, Балтыйскага флоту і Румынскага фронту (18-24.10(31.10 –6.11).1917). У лістападзе 1917 г. увайшоў у склад Выканаўчага камітэту Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамах). У снежні 1917 г. камісар аддзелу апекі СНК Заходняй вобласці і фронту. Дэлегат Усебеларускага з'езду 1917 г. (працаваў у яго ваеннай секцыі, падтрымліваў ідэю стварэння беларускага войска для абароны краю), у знак пратэсту супраць разгону з'езду бальшавікамі пакінуў пасаду камісара. Да 1918 г. у ВМФ. У 1918 – 1920 г. г. у Чырвонай Арміі, палітрук радыёсувязі 16-й арміі (Заходні фронт). У 1920 – 1954 г.г. на савецкай і партыйнай працы ў БССР, у тым ліку ў 1932-1933 гг. загадчык Сакратарыяту ЦВК БССР, у 1944 – 1946 гг. намеснік старшыні Бабруйскага аблвыканкаму. Паводле ўліковых партыйных дакументаў, лічыўся членам КПСС з ліпеня 1917 г. Аўтар кароткіх успамінаў пра рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. (апублікаваны ў газетах "Чырвоная змена" за 3 лютага 1957 г. і "Магілёўская праўда" за 16 кастрычніка таго ж года). Памёр у 1965 г.

У віхуры бурлівага палітычнага жыцця 1917 – 1918 гг. актыўна шукалі сваю нішу і маракі беларускага паходжання. Той жа Васіль Муха, як бачна з яго кароткага жыццяпісу, у 1917 г. тройчы мяняў сваю партыйную прыналежнасць. У асяроддзі нашых землякоў-балтыйцаў былі прыхільнікі не толькі агульнарасійскіх партый, але і нацыянальнай палітычнай сілы беларусаў – Беларускай сацыялістычнай грамады. У адным толькі Гельсінгфорсе – тагачаснай галоўнай базе Балтыйскага флоту – дзейнічала арганізацыя БСГ, якая налічвала каля 200 маракоў.

Маракі ўраджэнцы Беларусі ўдзельнічалі ў розных з'ездах і сходах. Так, матрос Кузняцоў на VII сходзе Менскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў 29 сакавіка 1917 г. выступіў па-за чаргой і прывітаў удзельнікаў сходу ад імя Балтыйскага флоту. Другі матрос – Е. А. Мар'янкоў – уваходзіў у склад Беларускага абласнога камітэту пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў, дзе ён прадстаўляў сялян Магілёўскай губерні. На II сесіі Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый, што праходзіла ў Менску ў кастрычніку 1917 г., сярод большасці дэлегатаў былі не толькі вайскоўцы з дзеючых армій і сяляне, але і прадстаўнікі Гельсінгфорскага флоцкай залогі.

Яшчэ адзін прыклад палітычнай актыўнасці, а таксама нацыянальнай свядомасці маракоў-беларусаў – удзел іх у працы Усебеларускага з'езду, які адбыўся ў Менску ў снежні 1917 г. Разам з Васілём Мухам тут прысутнічалі матросы Балтыйскага флоту А. Дулін і П. Вярбіцкі. Дулін з'яўляўся адным з чатырох таварышаў старшыні ваеннай секцыі з'езду, а Вярбіцкі быў сакратаром на пасяджаннях гэтага прадстаўнічага форуму. Пасля разгону Усебеларускага з'езду бальшавікамі ўсе тры згаданыя матросы ўвайшлі ў лік сяброў яго Рады, пратэставалі супраць гвалтоўнага зрыву працы з'езду (да іх пратэсту далучыўся і матрос-балтыец Кукушкін).

Нашы флоцкія суайчыннікі выступалі і з патрабаваннем перагляду або анулявання несправядлівай для Беларусі Брэсцкай мірнай дамовы 1918 г., аб чым сведчыць рэзалюцыя сходу беларусаў-маракоў Балтыйскага флоту ў Петраградзе ад 13 жніўня 1918 г. (апублікавана ў газеце "Звезда" за 6 верасня 1918 г.).

Аднак не адны толькі палітычныя справы цікавілі флоцкіх воінаў-беларусаў. Яны займаліся і дабрачыннасцю. Пра гэта сведчыць тое, што бежанская секцыя Усебеларускага з'езду ў газеце "Вольная Беларусь" за 21 снежня 1917 г. выказала падзяку матросам Балтыйскага флоту за прысланыя праз Васіля Муху ахвяраванні на карысць абяздоленых 1-й сусветнай вайной беларусаў-уцекачоў.

Такім уяўляецца беларускі рух у расійскім Балтыйскім флоце ў 1917 – 1918 г.г. Што датычыцца праяў беларускага руху ў іншых расійскіх флатах, то пра гэта ў гістарычнай літаратуры практычна няма звестак. Тэарэтычна такі рух мог існаваць у разгледжаны намі час у расійскім Чарнаморскім флоце, але, каб высветліць гэта, патрэбны пошукі ў архівах па-за межамі Беларусі.

Уладзімір Калаткоў,
малодшы навуковы супрацоўнік
Інстытута гісторыі
Нацыянальнай акадэміі
навук Беларусі.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная калегія:
Людміла Дзіцэвіч, Алесь Гурыновіч, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 9. 10. 2000 г.
Накпад 2900 асобнікаў. Замова № 2549
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 171 руб., 3 мес.- 513 руб.
Кошт у розніцу: 45 руб.